Пад Ваша здароўе, каханне і шчасце — у будучым годзе свінні не падкласці. З 2007-м!!!

№№208–209
(2519–2520)

29 снежня 2006 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная воля».
Кошт — свабодны.

Да ўвагі!

Хто не зрабіў перадаплату і хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

Наведвайце сайт «Народнай волі»!

Паважаныя чытачы "Народнай волі"!

Знайсці нас у Інтэрнеце можна па адрасе **www.nv-online.info**

Там вы зможаце прачытаць артыкулы апошніх нумароў газеты і абмеркаваць іх, даведацца пра падзеі ў краіне і свеце на стужцы навін, напісаць электронны ліст у рэдакцыю.

Архіў газеты можна паглядзець па адрасе **http://nv.promedia.by**

ОТКРЫТЫМ ТЕКСТОМ

Сергей СИДОРСКИЙ, премьер-министр Республики Беларусь:

— Минск, горисполком не принимают мер по исполнению решений правительства. Мы четко видим, что на сегодняшний день в центре города Минска и в местах, которые имеют более высокую кадастровую оценку земли, все участки отдаются коммерческим структурам. Государственные предприятия, расположенные в городе Минске, строительные, получают все площадки с меньшей кадастровой оценкой земли и, естественно, стоимость такого жилья, которое они могли бы построить коммерчески для жителей, которые не состоят на учете, а деньги перенести на социальное жилье, сегодня фактически этого не происходит.

Это первое. Второе, на сегодняшний день Минский горисполком, имея собственную строительную базу — Минскстрой, МАПИД, работает в одну смену. А были случаи в этом году, когда мы дважды указывали Минскому горисполкому, что предприятие работало по укрощенной неделе, сокращенной. А фактически оно работает в три смены (имеется в виду может работать в три смены. — Ред.) тогда оно будет делать панели и будет возводить дома социальные, которые мы, правительство, поручили Минскому горисполкому отработать. Не только не понимает решения правительства, но и на 2007 год игнорируются, и социальное жилье в городе Минске строить не намерены.

ОТ РЕДАКЦИИ

Этот фрагмент взят не из письменного варианта выступления премьер-министра, а из его устной речи. Поэтому не стоит обращать внимания на стилистические огрехи. Важно другое: центр Минска "схвачен" коммерческими структурами. "Схвачен" не ради государственных интересов, а ради чьих-то личных. В таком случае можно смело вести разговор и о коррупции...

КА-РА-ВУЛ!

Еўропа больш не гуляе ў абяцанкі-цацанкі з афіцыйным Мінскам

Еўрапейскі Саюз нарэшце паставіў тлустую кропку ў "беларускай праблеме": калі на працягу шасці месяцаў урад нашай краіны не выканае 12 рэкамендацый МАП, то яна будзе пазбаўлена гандлёвых ільгот.

Бутон праблем, які выспяваў ад лета 2000 года, калі чатыры незалежныя прафсаюзы накіравалі ў Міжнародную арганізацыю працы (МАП) скаргу на ўмяшальніцтва беларускіх улад ва ўнутраныя справы, лопнуў і рассыпаўся веерам праблем. Галоўная з іх — штогадовая страта "прэміяльных" можа дасягаць сумы ў 300—400 (па розных ацэнках) мільёнаў долараў.

Акрамя гэтага, непазбежны ўскосныя страты. Тыя ж калійныя ўгнаенні, ад экспарту якіх Беларусь мае значную частку валюты, наогул могуць аказацца неканкурэнтаздольнымі.

Еўропа не пажадала далей верыць абяцанкам-цацанкам афіцыйнага Мінска, і ўжо 5 снежня эксперты Еўрасаюза выказаліся за магчымую адмену гандлёвых прэферэнцый. Супраць галасавалі толькі новыя члены ЕС — суседзі: Польшча, Літва, Латвія. Іхнія інтарэсы відавочныя і носяць выключна эканамічны характар. ЕС прыслухоўваецца да іхняга голасу, але вырашальнай ролі гэта не іграе. 20 снежня Еўрасаюз прыблізіў Беларусь да пазбаўлення гандлёвых прэферэнцый.

Крыўдна, што краіна сама паставіла сябе ў шэраг трэцеразрадных: дагэтуль ад моманту заснавання Агульнай сістэмы прэферэнцый у 1971 годзе толькі адна краіна — Бірма — у 1997 годзе "заслужыла" такога ж сумнеўнага гонару.

Дзеля справядлівасці трэба зазначыць, што, хай сабе і фармальна, але Беларусь яшчэ мае ў запасе шэсць месяцаў, каб выправіць сітуацыю. Рашэнне Еўрасаюза ўступае ў законную сілу толькі з сярэдзіны 2007 года.

ВЗГЛЯД ИЗ МОСКВЫ

Минск в одном шаге от российско-белорусского кризиса

Андрей СУЗДАЛЬЦЕВ

Предновогодний Минск производит неизгладимое впечатление. Внезапная волна оптимизма, охватившая высшую белорусскую номенклатуру, на фоне драматического тренда в отношениях Минска с Москвой выглядит драматично.

Видимо, за долгие годы нахождения у власти, А.Лукашенко настолько приучил правящий класс и белорусское общество к регулярным "чудесам", что и в настоящее время никто уже и не ожидает иного формата разрешения проблем, кроме как сказочного...

Однако в целом население республики демонстрирует определенное здравомыслие и понемногу скупает валюту, а заодно опустошает рублевые депозитные счета. Еженедельные заклинания Петра Прокоповича — белорусский рубль стабилен, доверие к белорусской банковской системе растет, золотовалютные запасы страны пополняются, производят скорее негативное впечатление. Как всегда, белорусские граждане руководствуются неким "шестым чувством".

После исчезновения 20 декабря личного казначея С.Ниязова Александра Жадана, что, не исключено, оказало критичное воздействие на самочувствие президента Туркменистана, внимание к личности П.Прокоповича выросло на порядок. Ведь ни для кого не является секретом, что председатель Национального банка Республики Беларусь давно совмещает руководство главным финансовым институтом страны с оперативным управлением других финансовых потоков.

Я пишу эти строки, когда до 1 января остаются считанные дни. Беларусь до сих пор не имеет контракта на поставку природного газа, нет и контракта на транзит газа через белорусскую территорию в Польшу, Литву и Калининградскую область. Руководство "Газпрома" нервничает.

Нельзя сказать, что официальный Минск затаился в партизанской засаде. В конце прошлой недели А. Лукашенко звонил президенту России, убеждал в готовности выполнить все договоренности, утвержденные на последней встрече двух глав государств 15 декабря, но, безусловно, телефонными звонками и даже многочасовыми встречами не восстановить главного, что утеряно в российско-белорусских отношениях — климата доверия между российской элитой и белорусским политическим классом. Минску больше не верят...

Судя по всему, не сегодня-завтра А.Лукашенко технически будет готов подписать соглашение о передаче 50% акций ОАО "Белтрансгаз" "Газпрому" с перспективой зачета данного актива в цену поставляемого в 2007 году российского природного газа.

Попутно энергетические ведомства Республики Беларусь подготовили к подписанию (вместе с пакетом документов о создании газотранспортного СП) контракты о поставке в Республику Беларусь природного газа и газового транзита через Республику Беларусь на 2007 год.

Но, как всегда, белорусские власти успели проговориться. В данном случае отличились двое. В конце минувшей недели вице-премьер белорусского правительства В.Семашко объявил, что белорусская сторона ведет переговоры с "Газпромом" в русле решений, принятых на российско-белорусском саммите 15 декабря, что позволит получать Беларуси в 2007 году российский газ по цене меньше, чем 130—140 долларов. Почти одновременно министр энергетики Республики Беларусь А.Озерец заявил, что газотранспортное СП на базе "Белтрансгаза" будет создано только в 2007 году. Благодаря этим двум заявлениям общий сценарий "новогоднего газового бала" стал более прозрачен.

Итак, в высшей степени сомнительно, что основной "газовый пакет будет подписан до 31 декабря 2006 года. Видимо, А.Лукашенко будет стремиться до последней секунды завершающегося 2006 года интриговать Москву и руководство "Газпрома" подготовленными к подписанию документами.

Не исключено, что белорусское руководство, поставив ОАО "Газпром" перед фактом практически завершившихся переговоров о создании газотранспортного СП, попытается получить контракт на поставку газа в техническом варианте, одновременно отодвинув подписание контракта о газотранспортном СП формально на пару недель, то есть в январе 2007 года. Официальный Минск попытается сыграть на том, что, по его твердому мнению, руководство "Газпрома" не решится на два действия:

1) "Газпром" не решится на поставку газа зарубежному партнеру без контракта;

2) "Газпром" не решится на отключение поставки газа в Республику Беларусь.

Следовательно, схема действий белорусского руководства проста и одновременно вполне эффективна:

продемонстрировать "Газпрому" уже готовые (без некоторых "досадных" мелочей, вроде утверждения Устава СП на очередном заседании Совмина Республики Беларусь) документы по созданию газотранспортного СП и одновременно поставить российскую сторону в положение, когда нельзя уже согласного на все условия партнера по газовому транзиту оставить без газа на 2007 год и устраивать международный скандал. В итоге у Минска появляется вполне реальная надежда вырвать контракт и получить газ в 2007 году по 100—130 долларов. Естественно, в этом случае после 1 января уже не белорусские партнеры будут обивать пороги "Газпрома" и иных российских ведомств, а "Газпром" будет метаться между Москвой и Минском, ожидая обещанное газотранспортное СП. Рычагов воздействия на откровенно саботирующего Минска у "Газпрома" в этом случае не останется. Раздельное подписание газовых документов не оставит "Газпрому" иного выхода, как смириться и продлить еще на год газовые привилегии для Беларуси. Правовые преимущества будут целиком на белорусской стороне.

(Окончание на 2-й стр.)

КАМЕНТАРЫЙ

«Цяжка назваць гэта перамогай...»

Аляксандр ЯРАШУК, лідэр Беларускага Кангрэса дэмакратычных прафсаюзаў (БКДП) — аднаго з чатырох прафаб'яднанняў, што ініцыявалі скаргу ў МАП улетку 2000 года, не лічыць санкцыі з боку Еўропы перамогай. Хаця фармальныя падставы для падобнага меркавання існуюць. Прафлідэр абвяргае чуткі, што Італія выступіла за пазбаўленне Беларусі гандлёвых прэферэнцый з-за скандалу з Вікай Мароз. (Верагодна, скандал з Вікай Мароз усё ж аказаўся важным фактарам, які схіліў чашу аргументаў афіцыйнага Рыма ў падтрымку эканамічных санкцый, а не супраць; нездарма Італія адмовілася прымаць на Каляды ўсіх беларускіх дзяцей).

— Рашэнне Еўрасаюза пакуль ні па кім не б'е: яно не ўступае ў сілу з 1 студзеня 2007 года, — гаворыць Ярашук. — Цягам паўгода ўрад мае магчымасць выправіць сітуацыю. Патрабуецца самая драбяза — добрая воля. Ну і, вядома, адчуванне адказнасці за народ, якім гэты ўрад кіруе.

— **Што мусіць зрабіць урад, каб не дапусціць ажыццяўлення эканамічных санкцый?**

— Праграма-мінімум — выкананне 12 рэкамендацый МАП, якія ўрад браў на сябе абавязкі выканаць яшчэ да 1 чэрвеня 2005 года. Цяпер, праз два гады, сітуацыя вярнулася ў больш абвостранай форме.

— **З 2000 года, з моманту падачы скаргі, мінула ўжо шэсць год. Ці мае ўрад шанцы выправіць за шэсць месяцаў усё тое, што здолеў нарабіць за шэсць гадоў?**

— Калі зыходзіць з логікі развіцця сітуацыі, у тое верыцца з цяжкасцю. Не думаю, што ўрад Лукашэнкі з імпэтам кінецца выконваць рэкамендацыі МАП. Але ў яго ўжо няма часу і магчымасцяў маніпуляваць працэсам, больш такія нумары не пройдуць.

Георгій ГЛЕБУСЬ.

«Хвалепадобны» працэс

Пазбаўленне Беларусі гандлёвых прэферэнцый у стасунках з краінамі Еўрасаюза "каштуе" 300—400 мільёнаў долараў ЗША. Гэта прамыя страты ад таго, што краіна змушана будзе плаціць 10% мытных пошлін, якія да апошняга часу Беларусь не плаціла. Эканамісты пагаджаюцца, што толькі прадпрыемствы "Белнафтахіма" могуць — у выніку падзення экспартных паставак — недаатрымаць да 100 мільёнаў долараў ЗША ў год. Страты ад недапаставак калійных угнаенняў на еўрапейскі рынак значна вырастуць, асабліва калі будзе працягвацца бяздарная праца "Беларускай калійнай кампаніі".

"Пры ўстойлівым высокім попыце на дадзены тавар і растучых цэнах загнаць "Беларускалій" у цяперашняе становішча маглі толькі надзвычай легкадумныя рашэнні. За тры кварталы экспарт калійных угнаенняў у цэнавым выражэнні скараціўся на 13,4%, у фізічным — амаль на 20%. У выніку экспарт нашага калійнага дасягнення амаль не перасягне 1 мільярда долараў, як гэта было летась. Планіравалі атрымаць на 100 мільёнаў больш, атрымаем як мінімум на 50 мільёнаў менш", — гаворыць эксперт **Яраслаў Раманчук**.

І гэта пры тым, што адмена льгот яшчэ не ўступіла ў юрыдычную сілу.

Відавочна, пазбаўленне гандлёвых прэферэнцый носіць "хвалепадобны характар": як пасля кінутага ў ваду каменя па паверхні разыходзяцца кругі, так і пазбаўленне льгот можа прывесці да скарачэння паставак беларускага тэкстылю ў краіны Еўрасаюза, іншай прадукцыі; гэта ў сваю чаргу б'е па прадпрыемствах галіны: магчымае скарачэнне працоўных месц (гучала лічба, што прыйдзецца скарачаць да 100 тысяч працоўных месц, асабліва ў памежных рэгіёнах), верагоднае павелічэнне цэн на ўнутраным рынку.

Кіраўнік навукова-даследчага "Цэнтра Мізеса" Яраслаў Раманчук заўважае: нават Міністэрства працы і сацыяльнай абароны насельніцтва прызнае, што 25% існуючых працоўных месц у цяперашняй структуры вытворчасці незадзейнічаныя, а значыць, "лішнія". Таму і лічба ў страце 100 тысяч працоўных месц эканамісту бачыцца досыць "умоўнай і спекулятыўнай".

Эканамісты тлумачаць: разлікі магчымых страт *"робяцца на кумулятыўных працэсах у адной галіне вытворчасці"*. Калі, да прыкладу, пазбаўленне гандлёвых прэферэнцый выклікае падзенне попыту на беларускі тэкстыль у краінах Еўрасаюза, то да названых ужо 300—400 мільёнаў долараў страчанай *"прэміі"* варта дадаць яшчэ 30—40% стратаў у тых галінах, якія *"абслугоўваюць"* тэкстыльную вытворчасць. Гэта значыць, што 30—40 працэнтам прадукцыі, якая пастаўлялася на рынкі Еўрасаюза, будзе пастаўлены шчыльны заслон на межах ЕС.

Зніжэнне ўзроўню продажу зноў жа тэкстылю ў краіны Еўрасаюза прывядзе да таго, што тэкстыльная прамысловасць *"кампенсуе"* страты на знешнім рынку за кошт рынка ўнутранага. Канкрэтныя страты не бярэцца называць ні адзін эканаміст. Яраслаў Раманчук нагадаў сітуацыю з Украінай, калі паміж Кіевам і Масквой вялася *"газавая вайна"*. Тады Украіне прарочылі падзенне валавога ўнутранага прадукту, аднак украінскі ВВП, наадварот, вырас на тры працэнты.

Падсумоўваючы, трэба сказаць: назваць канкрэтныя страты ад пазбаўлення гандлёвых льгот дакладна немагчыма. Аднак гэта *"хвалепадобны"* працэс, які, закрануўшы адзін бок беларускай эканомікі, будзе зацягваць у сваю арбіту іншыя бакі эканомікі. А гэта надзвычай балючы працэс.

Кастусь ЛЕГАНЬКОЎ.

Рекомендации Международной организации труда (МОТ), которые белорусское правительство обязывалось выполнить к 1 июня 2005 года

1.Комиссия рекомендует Правительству принять все необходимые меры с целью немедленной регистрации перечисленных в жалобе незарегистрированных первичных профсоюзных организаций, в том числе, при необходимости, путем издания приказов руководителям предприятий о предоставлении помещений этим организациям. Эти меры должны быть приняты, невзирая на существующие якобы препятствия на пути их регистрации, созданные Декретом №2, его правилами и положениями.

2. Комиссия рекомендует Правительству внести изменения в соответствующие положения Декрета №2, в его правила и положения с тем, чтобы устранить любые дополнительные препятствия, которые могут быть вызваны либо требованием о юридическом адресе, либо требованием о 10-процентном минимальном числе членов профсоюза от общей численности работников предприятия, и обеспечить прозрачность этих положений.

3. По мнению Комиссии, многие из трудностей, вызванных применением Декрета №2, обусловлены отсутствием прозрачности в деятельности принимающего решения органа, представленного Республиканской комиссией по регистрации. С учетом того, что регистрация должна быть формальной процедурой, легализирующей существование свободно сформированной организации трудящихся или работодателей, Комиссия рекомендует распустить Республиканскую комиссию по регистрации и проводить регистрацию в качестве административной формальности на соответствующем местном, областном или республиканском уровне. В случае необходимости Министерству юстиции могут быть предоставлены полномочия надзирающего органа.

4. С целью ликвидации ущерба, который был уже нанесен независимости профсоюзного движения в Беларуси, Комиссия рекомендует Правительству обнародовать все ее заключения и рекомендации путем их широкого и безотлагательного распространения. С целью обеспечить предотвращение последующих актов вмешательства, Комиссия рекомендует Правительству публично заявить о том, что такие акты являются неприемлемыми и повлекут за собой наказание. В этих целях она настоятельно рекомендует Администрации Президента отдать распоряжения Генеральному прокурору, министру юстиции и управляющим делами судов тщательно рассматривать любые поданные профсоюзами жалобы в отношении вмешательства в их дела. Эта рекомендация, сходная с теми рекомендациями, которые неоднократно давались Комитетом по свободе объединения, должна быть незамедлительно выполнена.

5. Всем тем организациям, которые были упомянуты в заключениях как пострадавшие от вмешательства в их внутренние дела, должна быть гарантирована защита в отношении свободного осуществления ими своей деятельности. Любые последующие жалобы, поданные этими организациями в этом отношении, должны основательно и немедленно расследоваться независимым органом, пользующимся доверием всех соответствующих сторон.

6. Во избежание актов вмешательства, происходящих на уровне предприятий, Комиссия рекомендует направить всем руководителям и директорам предприятий в тех случаях, когда они по-прежнему являются членами профсоюзов, четкое указание не участвовать в процессе принимаемых профсоюзами решений, поскольку такое участие может оказать неправомерное влияние на внутренние дела профсоюзов и в действительности подчинить эти организации администрации предприятий.

7. Комиссия рекомендует принять незамедлительные меры с целью проведения независимых расследований лицами, пользующимися доверием всех соответствующих сторон, в отношении нерассмотренных жалоб на антипрофсоюзную дискриминацию, в частности, на пристрастное и дискриминационное использование срочных контрактов, а также компенсировать весь нанесенный в этой связи ущерб. Любым жалобам на антипрофсоюзную дискриминацию или репрессивные меры, как следствие сотрудничества с Комиссией и МОТ, должно уделяться особое внимание.

8. Комиссия далее рекомендует Правительству установить эффективный порядок защиты от антипрофсоюзной дискриминации и других репрессивных мер. Адекватная защита или даже иммунитет от административного ареста должны быть гарантированы профсоюзным работникам при исполнении ими своих обязанностей или осуществлении ими своих гражданских свобод (свободы слова, свободы собраний и т.д.). Для обеспечения того, чтобы такая защита дополнительно гарантировалась при помощи беспристрастной и независимой судебной системы и надлежащего отправления правосудия, Комиссия рекомендует Правительству осуществить рекомендации, данные Специальным докладчиком Организации Объединенных Наций в отношении независимости судей и адвокатов.

9. Комиссия рекомендует внести изменения в Декрет №24 об использовании иностранной безвозмездной помощи, как это было предложено контрольными органами МОТ, с целью обеспечения того, чтобы организации трудящихся и работодателей могли эффективно организовать свою деятельность, а также пользоваться помощью, предоставляемой международными организациями трудящихся и работодателей в соответствии со статьями 5 и 6 Конвенции.

10. Комиссия далее рекомендует внести изменения в Закон о проведении массовых мероприятий (а также в Декрет №11, если он еще до сих пор не отменен), как это ранее предлагалось контрольными органами МОТ, с тем, чтобы привести его в соответствие с правом организаций трудящихся и работодателей организовывать свою деятельность, предусмотренным в статье 3 Конвенции.

11. Комиссия рекомендует Правительству обеспечить, чтобы БКДП, который уже имеет одно место в Национальном совете по трудовым и социальным вопросам (НСТСВ) было разрешено участвовать в его заседаниях и быть представленным там любым лицом, которое он назначит, и также принять меры с целью обеспечить право всех сводных профсоюзных организаций, представляющих профсоюзы в Беларуси, участвовать в работе НСТСВ. Участие БКДП в работе НСТСВ должно быть обеспечено без промедления.

12. Комиссия рекомендует Правительству провести всесторонний обзор системы трудовых отношений с целью обеспечения четкого разграничения между ролью Правительства и ролями социальных партнеров, а также оказания содействия развитию полностью независимых структур организаций трудящихся и работодателей.

Народная Воля http://www.nv-online.info
29 СНЕЖНЯ 2006 г.

АСОБА

Павел Севярынец піша раман пра Беларусь

30 снежня спаўняецца 30 год мужнаму беларускаму палітыку Паўлу Севярынцу.

Найбольшы розгалас імя Паўла набыло ў 2005 годзе, калі ён стаў палітычным вязнем. За "актыўны ўдзел у масавых беспарадках" Павел быў асуджаны на 3 гады пазбаўлення волі. Тады ж, у адпаведнасці з амністыяй, гэты тэрмін быў скарочаны да 2 год. З тае пары Севярынец працуе пад вартай на лесапавале ў Полацкім раёне, у вёсцы Малое Сітна.

За 20 дзён да свайго юбілею ён атрымаў планавы кароткатэрміновы водпуск у Віцебск, да бацькоў. З ім сустрэўся пазаштатны карэспандэнт "Народнай волі".



— Павел Канстанцінавіч, я помню Вас падлеткам, ведаю, што Вы раслі ў рускамоўным асяродку і да пэўнага часу былі далёка ад палітыкі. Але вось аднойчы, калі мы з Вашым бацькам разам ад'язджалі з Мінска ў Віцебск, Вы, тады студэнт БДУ, пайшлі праводзіць нас на цягнік. Я са здзіўленнем пачуў, як Вы хораша размаўляеце па-беларуску. А неўзабаве стала вядома пра Вашу палітычную дзейнасць. Скажыце, якія людзі або падзеі выклікалі такія змены ў Вашым светапоглядзе?

— Наша сям'я была дэмакратычным асяродкам, і гэта зрабіла адбітак на мне з ранняга дзяцінства. Бацька працаваў журналістам і добра ведаў, што навокал адбываецца. У самым пачатку 1994 года, падчас прэзідэнцкай кампаніі, у Віцебск на сустрэчу з выбаршчыкамі прыязджаў Зянон Пазьняк. За тыя чатыры гадзіны ў тэатры імя Я.Коласа мне і стала зразумела, што такое *беларуская нацыянальная палітыка.* На першым курсе факультэта геалогіі БДУ ў Мінску, куды я паступіў улетку 1994-га, дзякуючы акадэміку Радзіму Гарэцкаму большасць прадметаў выкладалася на роднай мове. А ўвосені таго ж года (дакладна памятаю дзень — 20 лістапада) я сам пачаў размаўляць па-беларуску. Паралельна з вучобай я працаваў у газеце "Знамя юности". Пасля рэферэндуму-95 я напісаў артыкул пра нашу геалагічную практыку, адкуль рэдактар выразаў згадку пра бел-чырвона-белы сцяг. Тады я прыняў рашэнне пакінуць газету, а на ганарар ад гэтай куртатай публікацыі пайшоў на вуліцу Варвашэні, 8 і набыў такі самы "крамольны" сцяг. Якраз там і пазнаёміўся з Вячаславам Сіўчыкам і будучымі маладафронтаўцамі.

— Вернемся да Вашага дзяцінства. Вы захапляліся мінералогіяй, збіралі калекцыю камянёў. Што засталося ў Вашым жыцці ад таго захаплення?

— У школьныя гады ў мяне сабралася вялікая, больш за 2000 узораў, калекцыя беларускіх мінералаў ды іншых парод. Былі цэлыя секцыі выкапняў. Крэменяў, гранітаў, глін. Самая цікавая частка калекцыі — прыгодныя для ювелірнай апрацоўкі камяні, што трапляюцца на Беларусі. Быў збор чырвоных гранатаў (альмандзінаў), кварцытаў, дымчатага кварцу, каляровых халцадонаў, бурштыну. Усё гэта захавалася. Ёсць і зусім рэдкія: авантурын, карнеол, сердалік, хрызапраз, яшма, марказітавыя канкрэцыі, пегматыт. Большасць гэтага сабраная ў кар'ерах і па берагах рэк вакол Віцебска. Захапленне ў рэшце рэшт увасобілася ў вышэйшую адукацыю і дыплом інжынера-геолага. А калекцыя зараз для мяне — яшчэ адно сведчанне багацця і прыгажосці зямлі, якую даў нам, беларусам, Бог. Мала хто ведае, але сярод больш як сарака краін Еўропы Беларусь уваходзіць у дзесятку самых забяспечаных прыроднымі рэсурсамі.

— У школе Вы вызначаліся мастацкімі здольнасцямі. Вашы малюнкі на выставе дзіцячай творчасці выклікалі ўсеагульнае захапленне. А праз колькі год, калі Вы былі ўжо студэнтам БДУ, я прачытаў у газеце Ваша апавяданне і ўбачыў, што аўтар — літаратурна адораны чалавек. Чаму Вы не сталі ні мастаком, ні белетрыстам? Ці не ўзнікла думка напісаць, прыкладам, аповесць або раман і праілюстраваць гэты твор сваімі малюнкамі?

— Дзякуй бацькам, якія аддалі мяне ў мастацкую школу. Штогадовыя плэнэры на віцебскіх вуліцах, дзе ў свой час працавалі Марк Шагал, Казімір Малевіч, Ілля Рэпін — гэта была казка. Па сканчэнні мастацкай школы ў 1994 годзе працягваў маляваць яшчэ некалькі гадоў адмысловую графіку (каляровая крэйда з чорнай асадкай). У пару студэнцтва, у сярэдзіне 1990-х, набытая мастацкая спецыяльнасць мяне ў прамым сэнсе карміла: адзін хлопец з нашага курса як менеджэр дамаўляўся за добры абед зрабіць партрэт жыхара ці жыхаркі інтэрната, я маляваў і кармілі абодвух. Потым рабіў краявіды, нацюрморты, плакаты "Маладога фронту"... Гады са два запар выстаўляўся ў сталіцы. Зараз нестае часу. Хаця, бывае, што і цягне да малявання: тут, у Малым Сітне, такое хараство навокал!

А літаратурай займаюся, можна сказаць, штодня. Апублікаваў тры кнігі, рыхтую да друку яшч дзве. Асноўныя тэксты можна знайсці ў прэсе апошніх дзесяці гадоў і на сайце *www.sieviarynets.net.* І галоўнае — пішу раман пра Беларусь.

— Як Вы сёння, напярэдадні сур'ёзнага юбілею, ацэньваеце сэнс і вынікі Вашай палітычнай дзейнасці?

— У першую чаргу створаны масавы маладзёжны рух, які грунтуецца на нацыянальнай ідэі і хрысціянскіх прынцыпах, — незарэгістраваная арганізацыя "Малады фронт". Дзень Святога Валянціна, кампаніі "Горад — наш!" і "Беларусь — у Еўропу!", абарона Курапатаў, сотні іншых акцый і флэшмобаў — гэта толькі знешнія эфекты. А сэнс гэтай дзесяцігадовай дзейнасці — ідэйнае лідэрства сярод беларускай моладзі. Новая генерацыя беларусаў замест транспаранта "А мне всё пофиг!" падымае бел-чырвона-белы сцяг Хрыста, пачынае адмаўляцца ад цынізму, грамадскай пасіўнасці, алкагалізму і наркаманіі, спажывецкай філасофіі і выбірае Бога Беларусь. Зараз, паглядзіце, пад ціскам рэпрэсій ужо колькі маладзёжных арганізацый знікла, сціішылася, амаль ліквідавалася, а "Малады фронт", супраць якога ідзе сапраўдная вайна, стаіць у поўны рост. Зміцер Дашкевіч, Артур Фінькевіч, Павел Красоўскі з Жодзіна, Іван Шыла з Салігорска, Барыс Гарэцкі, Зміцер Хведарук, Насця Палажанка з Мінска — хваля ўжо новых лідэраў, якія павядуць за сабой беларускую моладзь. За апошняе дзесяцігоддзе вырасла цэлае пакаленне "Маладога фронту". У Беларусі можна па пальцах пералічыць апазіцыйныя партыі і недзяржаўныя арганізацыі, незалежныя газеты і даследчыя цэнтры, інтэрнет-праекты і адукацыйныя ініцыятывы, дзе б ні працавалі маладафронтаўцы. Пра гэта мне ўжо даводзілася пісаць у кнізе "Пакаленне "Маладога фронту".

Па-другое, з 1996 года я займаюся шырокай асветніцкай праграмай. За гэты час было праведзена больш як 430 "Шоу Беларушчыны", 5 курсаў "Дзіджэяў Адраджэння", дзесяткі беларускіх канцэртаў, сотні дыскатэк. Метадычны зборнік з гэтым досведам — чарговая кніга "Дзі-джэй Адраджэння", якую я напісаў і выдаў.

Па-трэцяе, зараз разам з Аляксеем Шэйным, Вітам Рымашэўскім, Георгіем Змітруком, Георгіем Салаўёвым, Мікалаем Арцюховым і Дзянісам Садоўскім разгортваем Беларускую хрысціянскую дэмакратыю — палітычную партыю, якая яднае беларускіх патрыётаў і хрысціян розных канфесій. Распрацавалі праграмныя дакументы, наладзілі паштовую і электронную рассылку, пачалося стварэнне тэрытарыяльных структур, рыхтуюцца першыя кампаніі. Але праграмныя мэты ні "Маладога фронту", ні БХД не дасягнуты і напалову. Таму — вынікі сваёй працы лічу толькі прамежкавымі. Ды ўсё ж веру, што галоўнае — яшчэ наперадзе.

— У Вашых бацькоў — трое дзяцей. Вам — трыццаць, а Вы яшчэ, так бы мовіць, кавалер. Ці ёсць планы наконт стварэння сям'і?

— Увогуле, моцная сям'я — разам з царквой, патрыятычным выхаваннем і развітым самакіраваннем ёсць адзін з падмуркаў здаровага грамадства і хрысціянскай дэмакратыі. Але цяперашняя Беларусь — знявераная, зняволеная, занядбаная — патрабуе не столькі добрых шлюбаў, колькі добрага змагання і ахвярнай працы. Таму для стварэння сям'і ў мяне зараз няма ні часу, ні ўмоў. Спачатку — перамога.

— Над чым Вы цяпер працуеце за пісьмовым сталом?

— Найперш штодня пішу лісты — за час "хіміі" іх прыйшло ўжо больш за 720, і мушу адказваць. Вельмі ўдзячны тым, хто піша і прыязджае. Рыхтую да друку зборнік артыкулаў, праграмных тэкстаў і апавяданняў 1997—2006 гадоў (кніга будзе мець назву "Брату"); вычытваю пераклад "Фенаменалогіі Беларусі" (яна ж — "Нацыянальная ідэя") на рускую мову (перакладае бацька). Але галоўная пісьмовая праца — раман. Гэта самая вялікая і сур'ёзная рэч, за якую я калі-небудзь браўся. Сённяшняй беларушчыне і беларускаму хрысціянству нестае буйных рэчаў. Калі Бог дасць, праз некалькі гадоў маю надзею завяршыць пачатае. Для мяне гэта сапраўды будзе падзея.

— Нехта з класікаў сказаў, што кожны годны чалавек мусіць пасядзець у турме. Ці згодны Вы з такой думкай?

— Турма — досвед, без якога годнаму чалавеку лепш абысціся. Але менавіта праз турэмныя выпрабаванні я прыйшоў да Хрыста і ўдзячны Богу за гэтае самае важнае ў маім жыцці адкрыццё, за школу гарту і духоўнага кшталтавання. У турме асабліва востра адчуваеш усю схільнасць да зла, сапсаванасць чалавечай прыроды, грэшнасць уласнай душы — і патрэбу ў Збаўцы. Для мяне турэмная камера — месца, дзе болей, чым на волі, часу на роздум і малітву.

— Дзе Вы адзначыце сваё трыццацігоддзе і сустрэнеце Новы, 2007-ы, год? З якімі надзеямі да яго набліжаецеся?

— Пастараюся вырвацца ў навагодні адпачынак. 30 гадоў — важная для мяне дата. Наш Гасподзь, Ісус Хрыстос, менавіта ў 30 год пачаў сваё зямное служэнне — і кожны хрысціянін ва ўзросце Хрыста рыхтуецца да асаблівых выпрабаванняў. Спадзяюся неўзабаве вызваліцца. Збіраюся разгарнуць асветніцкую ініцыятыву "Нацыянальнае Абуджэнне", мэтай якой ёсць беларусізацыя хрысціян і хрысціянізацыя беларусаў праз конкурсы, творчыя і адукацыйныя акцыі. Галоўная бяда сённяшняй Беларусі — бязвер'е. І грамадству, і апазіцыі не хапае духу. Адсюль і бязвольнасць, і апатыя, і страх, і сярэдненькія арыенціры, і пастаянныя паразы. Але беларуская нацыянальная ідэя сутнасна хрысціянская. Кажучы словамі Святога Пісьма, ідэя Беларусі — гэта вера, якая дзейнічае любоўю. Гэтай ідэі наканаваны грандыёзныя гістарычныя перамогі. Вялікая Беларусь, у якую веру, здольная збавіць ад зла Расію, а не толькі сябе, і ўзняць да хрысціянскага адраджэння ўсю астатнюю Еўропу.

— Дзякуй, Павел Канстанцінавіч, за шчырыя адказы. Дай Бог Вам адзначыць юбілеі сярод блізкіх, з бацькамі, і таксама па-сямейнаму, як у далёкім дзяцінстве, сустрэць 31-ы год жыцця, у якім, будзем спадзявацца, Вас чакае больш перамог, чым цяжкіх выпрабаванняў. На Вашым баку Праўда, а калі побач з Праўдай ідзе Вера, чалавека перамагчы нельга.

— Дзякуй за добрыя зычанні! Няхай Магутны Божа дабраслаўляе Вас воляю, вераю і сваёй ласкай...

Сяргей БУТКЕВІЧ.

ГОВОРЯТ ЦИФРЫ

Количество субъектов малого бизнеса и его доля в ВВП Беларуси

Показатель/год	2002 г.	2003 г.	2004 г.	2005 г.
Количество малых предприятий	29.044	30.987	32.824	33.094
Количество индивидуальных предпринимателей	189.557	188.783	183.887	177.900
Доля малых предприятий в ВВП	7,2%	8,2%	8,8%	8,1%.

Источник: *Министерство статистики и анализа Республики Беларусь, Министерство по налогам и сборам Республики Беларусь.*

АДМИНИСТРАТИВНЫЕ ПРОЦЕДУРЫ – ОСНОВНОЕ ПРЕПЯТСТВИЕ РАЗВИТИЮ БИЗНЕСА

% респондентов, указавших на препятствия, мешающие развитию бизнеса



Суд у бальніцы. Такога яшчэ не было

Бесчалавечнае абыходжанне з прадстаўніком РГА "Беларускі Хельсінкскі камітэт" (БХК) па Віцебску і Віцебскай вобласці ***Паўлам Левінавым*** *паказвае адносіны ўлад да грамадскіх актывістаў, якія ўдзельнічаюць у кампаніі па выбарах дэпутатаў мясцовых саветаў. Пра гэта гаворыцца ў распаўсюджанай прэс-службай БХК заяве ў сувязі з пагаршэннем стану здароўя П.Левінава.*

Прэс-служба БХК паведаміла, што 20 снежня адбылося слуханне па скарзе П.Левінава аб адмове яму ў рэгістрацыі кандыдатам у дэпутаты Віцебскага гарадскога савета дэпутатаў. У працэсе слухання высветлілася, што праверка сапраўднасці подпісаў грамадзян за вылучэнне П.Левінава праводзілася з парушэннем устаноўленай працэдуры. Аднак у задавальненні скаргі Левінаву было адмоўлена. Напрыканцы судовага пасяджэння ў Паўла Левінава павысіўся артэрыяльны ціск. Аднак пасля заканчэння аднаго слухання пачаўся другі працэс — аб адмове ў рэгістрацыі Паўла Левінава кандыдатам у дэпутаты Віцебскага абласнога савета дэпутатаў, нягледзячы на яго хадайніцтва аб адкладанні разгляду справы. Падчас азнаямлення з матэрыяламі справы стан Паўла Левінава значна пагоршыўся, і ён быў дастаўлены на машыне "хуткай дапамогі" ў бальніцу з дыягназам "гіпертанічны крыз 1-й ступені".

Як паведамляе прэс-служба БХК, у чацвер падчас абедзеннага перапынку ў бальніцы Паўла Левінава разбудзілі і прывялі ў кабінет урача, дзе знаходзіўся суддзя, пракурор, прадстаўнік выбарчай камісіі і чалавек, які, паводле наяўнай інфармацыі, сачыў за дзеяннямі суддзі. Згаданыя асобы сказалі, што ў Левінава было дастаткова часу ў бальніцы, каб падрыхтавацца да працэсу, заявілі пра пачатак слухання справы з тлумачэнняў Паўла Левінава. Праваабаронца заявіў адвод суддзі і пракурору і хадайнічаў аб допуску на працэс свайго прадстаўніка, бо сам ён не можа абараняць свае інтарэсы па стане здароўя, а таксама аб адкладанні слухання справы. Хадайніцтва Левінава былі адхілены. Падчас давання тлумачэнняў Павел Левінаў страціў прытомнасць, і пэўны час ён знаходзіўся пад кропельніцай.

Паводле інфармацыі БХК, Паўлу Левінаву адмовілі ў рэгістрацыі таму, што ён нібыта няправільна ўказаў юрыдычны адрас свайго месца працы — ЗАТ "Выдавецкі дом "Віцебскі кур'ер", якое двойчы мусіла мяняць адрас на працягу года. Апрача таго, у асабістай справе Паўла Левінава, што знаходзіцца ў ваенкамаце, не ўзгадана пра атрыманы ім медаль, хаця П.Левінаў прадставіў у камісію пасведчанне і сам медаль. Таксама яму пастаўлены ў віну нязначныя недакладнасці ў напісанні назвы інстытута, хаця ён і прадставіў копіі свайго дыплома. Тым не менш усе гэтыя абставіны не былі прыняты да ўвагі, і праваабаронца не быў зарэгістраваны.

Андрэй СЕРАДА.

«НЕПРИЧЕСАННОЕ» ПИСЬМО

Ни шагу назад!

Очень переживаю за Александра Козулина. Переживаю, как за очень близкого и родного мне человека. Сознаю, как тяжело ему, человеку сильному, высокообразованному, интеллигентному, во всех отношениях порядочному, ни в чем не виновному, переживать страшные издевательства. Цивилизованный мир выражает серьезную озабоченность здоровьем этого политического узника, осуждает режим Беларуси, принимает соответствующие декларации, за это большое спасибо.

Но такие меры уже не действуют на лукашенковский режим. Власть даже скрыла от широкой общественности послание Совета Европы белорусскому народу, в котором предлагаются для нашей страны очень выгодные условия сотрудничества, и потому необходимо переходить на более эффективные действия.

Одной из таких мер может стать принятие ООН следующего решения: страна — член ООН, в которой имеются политзаключенные, проводятся репрессии над инакомыслящими, запрещается свобода слова, Избирательный кодекс не соответствует международным нормам, лишается членства в ООН со всеми вытекающими отсюда последствиями. А чтобы не допустить прихода к власти диктаторов, при ООН необходимо создать медицинскую комиссию, которую в обязательном порядке должны проходить все кандидаты на участие в выборах главы государства — члена ООН. При игнорировании этой комиссии считать власть нелегитимной. А то странно у нас получается: для того, чтобы устроиться дворником, нужно проходить медкомиссию, а для будущего главы государства (или уже действующего) такая комиссия не нужна. С таким предложением нашим оппозиционным лидерам необходимо обратиться к руководству ООН.

Очень обидно, что Россия, как ни одна другая страна, активно поддерживает этот режим в Беларуси. Нынешний хозяин Кремля до сих пор публично не высказался с осуждением действий официального Минска относительно тюремного заключения экс-кандидата в президенты Республики Беларусь Александра Козулина. А вспомните, как в свое время президент Борис Ельцин настоял на освобождении журналиста Павла Шеремета. И это возымело действие — Павел тут же был освобожден.

Не согласен с подготовкой и проведением второго Конгресса демократических сил. Опять начнется игра амбиций лидеров партий.

На первом Конгрессе демсил остановились на А.Милинкевиче, А.Козулин заявил о себе сам. Оба лидера известны, и в стране, и за рубежом, и нужно работать на них и в дальнейшем. Они нигде себя не скомпрометировали, а если и были ошибки, то их нужно исправлять и двигаться дальше.

Идти "в народ" так, как предлагает читатель "Народной воли" В.Подлужный из Гомеля, не имеет смысла — это не приведет к положительному результату. Общение с народом крайне необходимо, и лидеры партий по возможности это делают. В том числе и А.Милинкевич. Активно пошел бы "в народ" и А.Козулин. Но режим этому неистово препятствует. Уже при выезде из Минска им на хвост садятся спецслужбы, обкладывают лидеров со всех сторон. Не допускают встреч в трудовых коллективах, блокируют въезды в города и регионы. Под колпаком и региональные лидеры. Сагитировать 5—10 человек для вступления в партию в настоящее время практически невозможно. Очень сомневаюсь, что В.Подлужный сам партиец, если предлагает такой путь агитации. Пытался ли он сам так действовать? Люди в своем большинстве прекрасно понимают нынешнюю ситуацию и пребывают в страхе — репрессии всем известны. А партии у нас воспринимаются как маргинальные вражеские группировки — на это активно работает государственная пропаганда.

Согласен, пора прекращать проведение бессмысленных семинаров, печатать разные бюллетени и листовки — для общего дела от этого пользы мало. Может, только некоторая часть имеет определенную выгоду. И если уж демсилы объединились и имеют общий руководящий орган, то и средства необходимо объединять. Централизованно решать: что проводить, что и сколько печатать, кому помогать, кому куда ехать и т.д. Короче, нужно прекратить самодеятельность, следует совместно работать на положительный результат.

На мой взгляд, те средства, которые планируется выделить на проведение второго конгресса, на организацию безрезультатных семинаров и других, не имеющих практической пользы, мероприятий, необходимо направить на спасение газеты "Народная воля" — одной из самых значимых независимых газет. Не будь ее, демократические силы вообще потеряют связь с народом.

Мы имеем возможность общаться с народом только во время избирательных кампаний, а общение с народом через "Народную волю", увеличивая ее тираж, а также сбор подписей против строительства АЭС, позволяет постоянно и легитимно общаться с народом, что, несомненно, даст положительный результат.

Успехов вам в работе! Ни шагу назад!

С уважением —

Максим ЛЫЧ,
житель Светлогорска.

Минск в одном шаге от российско-белорусского кризиса

(Окончание. Начало на 1-й стр.)

Кроме того, обращает на себя внимание педалирование Минском цены "Белтрансгаза" в 5 млрд долларов, хотя с конца ноября речь шла о 3—3,5 млрд долларов (именно такую цифру на прошлой неделе, сославшись на неких "независимых экспертов", назвал министр финансов Республики Беларусь Николай Корбут). Не исключено, что технически отодвинув подписание документации о создании СП в 2007 году белорусская сторона по примеру 2002 года попытается сорвать переговоры неподъемной ценой за производственные активы "Белтрансгаза" (для сравнения: стоимость газопровода "Северный поток" по дну Балтийского моря мощностью в пять раз больше нынешних транзитных возможностей "Белтрансгаза" составляет 9 млрд долларов).

Почему образовался столь сложный и практически неразрешимый тупик во взаимоотношениях между Минском и Москвой? Помимо исчезновения атмосферы доверия между двумя странами огромный вклад в разрастающийся на глазах российско-белорусский кризис внесла переговорная тактика, годами активно применяемая белорусской стороной. Алгоритм переговоров, заданный белорусским президентом, исключает малейшие уступки российской стороне. В инструкциях переговорщикам указывается на *"безусловную законность и обоснованность требований руководства Беларуси"*, требуется исключить из соглашений малейшие компромиссы. В случае затруднений рекомендуется ссылаться на союзные соглашения, волю белорусского народа, который *"не поймет"* Москву. В критическом варианте предлагается просить снисхождения к небольшой и небогатой стране — *"единственном союзнике"*, защищающем Россию с Запада. В наиболее сложном варианте белорусским переговорщикам предлагается перейти на режим бесконечных изматывающих переговоров и встреч. Попутно в белорусских государственных СМИ начинается информационная кампания давления, в которой активное участие принимают первые лица белорусского государства — С.Сидорский, В.Семашко и т.д.

Обращает на себя внимание активно подогреваемая не только белорусскими государственными печатными и электронными СМИ, но и непосредственно А.Лукашенко ожидания, что все проблемы, с которыми столкнулось белорусское руководство в последние два года о взаимоотношениях с Россией, преходящи и находятся в стадии разрешения. Градус ожидания окончательной "капитуляции" Москвы перед А.Лукашенко в Минске столь высок, что невольно позволяет сделать некоторые предварительные выводы.

С одной стороны, подогревая в населении республики ожидания разрешения всех надвигающихся проблем, причем основывая их на вере в способности белорусского президента *"убеждать"* Москву в *"справедливости требований белорусской стороны"*, белорусские власти в случае российско-белорусского газового кризиса (ситуация, когда 1 января у российского руководства не окажется на руках вообще никаких документов — ни о создании СП, ни о поставке газа в Республику Беларусь по рыночной стоимости, ни о газовом транзите через Республику Беларусь) могут прибегнуть к роли *"незаслуженно обиженных"*. В данном случае в белорусских СМИ немедленно появится формулировка *"вопреки достигнутым 18 декабря договоренностям с В.Путиным, российские должностные лица перешли на политику шантажа и т.д."*.

С другой стороны, в случае создания газотранспортного СП или организации целой кампании проволочек по его созданию, А.Лукашенко будет крайне заинтересован, чтобы в сознании белорусского общества он остался *"вторым белорусским Машеровым"*, славящимся в свое время своей неуступчивостью в отношениях с руководством КПСС. Поэтому прилагаются огромные усилия, чтобы взаимосвязь между ценой 50% пакета акций "Белтрансгаза" и ценой поставляемого в Республику Беларусь газа не была зафиксирована в белорусском обществе, как уступка Москве (продажа "Белтрансгаза" за дешевый газ). А.Лукашенко должен при любом варианте остаться победителем Москвы.

Судя по всему, белорусские власти попытаются утаить от белорусского народа факт продажи половины "Белтрансгаза". Но это повестка следующего, 2007, года. А пока, в оставшиеся считанные часы до 31 декабря 2006 года, белорусская сторона, безусловно, нервничает, но, как и в предыдущие годы, явно ждет какого-нибудь "чуда" или катастрофы, как, к примеру, Беслана, совпавшего с референдумом о снятии ограничений на избрание на пост президента А.Лукашенко.

Предновогоднее несчастье у соседа позволило бы Минску выиграть еще один год.

Минск находится в одном шаге от российско-белорусского кризиса.

СОЛИДАРНОСТЬ

Ректоры чешских вузов требуют освободить Александра Козулина

Чешская конференция ректоров — официальная ассоциация, в которую входят руководители всех чешских вузов — на последнем заседании приняла специальное заявление, в котором осудила репрессии против экс-кандидата в президенты Беларуси, а в прошлом ректора Белорусского государственного университета, политзаключенного Александра Козулина и призвала освободить его из тюрьмы.

Напомним, что ранее с аналогичным требованием к белорусским властям обратилось правительство Чехии. *"Чешская Республика призывает белорусские власти освободить оппозиционного лидера Александра Козулина и обеспечить ему немедленную медицинскую помощь"*, — говорится в заявлении Министерства иностранных дел Чехии.

В нем отмечается, что в случае отказа в необходимой помощи *"белорусское правительство столкнется с последствиями дальнейшего ухудшения репутации Беларуси на международной арене"*.

Народная Воля http://www.nv-online.info
29 СНЕЖНЯ 2006 г.

Казулін заклікае кандыдатаў зняцца з выбараў

Лідэр Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамада) Аляксандр Казулін заклікаў кандыдатаў у дэпутаты мясцовых Саветаў ад апазіцыйных партый да 7 студзеня зняць свае кандыдатуры з выбараў. Пра гэта БелаПАН паведаміў адвакат палітыка Ігар Рынкевіч, які сустрэўся з А.Казуліным у калоніі "Віцьба-3".

Паводле слоў адваката, экс-кандыдат у прэзідэнты назваў выбарчую кампанію "пародыяй на выбары". *"Казулін сказаў, што калі з 21 тысячы дэпутатаў тры-пяць апазіцыянераў і прызначаць дэпутатамі, гэта будзе яшчэ большай зняваг, чым у сакавіку 2006 года. Ён заклікаў не ўдзельнічаць у выбарах, але за гэты час данесці да беларускіх грамадзян праўду аб тым, што адбываецца ў краіне"*, — сказаў І.Рынкевіч.

